# ПЛАН-КАНСПЕКТ УРОКА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА” Ў VI КЛАСЕ ПА ТЭМЕ “ПАЭТЫЗАЦЫЯ ВОБРАЗА САЛДАТА Ў ВЕРШЫ МІКОЛЫ СУРНАЧОВА “У СТОПТАНЫМ ЖЫЦЕ”[1]

*Петрачэнка Марына Аляксандраўна*

**Мэта:** стварыць уяўленне пра гераічны вобраз салдата Вялікай Айчыннай вайны праз знаёмства з тэкстам твора М. Сурначова “У стоптаным жыце”.

**Задачы:**

стварыць уяўленне вучняў пра жыццёвы лёс аўтара верша – паэта Міколы Сурначова; звярнуць увагу на дакументальнасць твора;

садзейнічаць развіццю ў навучэнцаў вобразна-асацыятыўнага мыслення з мэтай засяроджвання увагі на сродках перадачы пачуццяў паэта, развіццю навыкаў выразнага чытання;

спрыяць выхаванню патрыятычных пачуццяў.

**Метады:** тлумачальна-ілюстрацыйны, практычны, праблемна-пошукавы.

**Формы працы:** франтальная, індывідуальная, парная.

**Абсталяванне:** выстава матэрыялаў (кнігі пра вайну, партрэт пісьменніка, рэпрадукцыі карцін, малюнкі дзяцей, чорны рамонак, белы рамонак), прэзентацыя.

## Ход урока[2]

### I. Арганізацыйны этап.

Празвінеў званок, пачаўся ўрок! Павярніцеся адзін да аднаго, паглядзіце ў вочы, усміхніцеся. А зараз пакладзіце на далонь усе непрыемныя думкі, дрэнны настрой. Павярніцеся да акна і здзьмуйце ўсё непрыемнае, а ў класе пакіньце толькі добры настрой, накіраваны на працу. А я вам жадаю поспехаў на ўроку.

Слайд 1 (малюнак 1).




Малюнак 1

### II. Этап матывацыі.

*Настаўнік прыводзіць дадзеныя статыстыкі (настрой на ўрок).*

На перадавой камандзір батальёна жыў адзін месяц.

Камандзір роты – тыдзень.

Камандзір узвода – тры дні.

Радавы пехацінец – адну атаку.

Пяхотная рота (100 чалавек) у атацы жыла 30 хвілін.

Экіпаж танка ў абароне жыў 15 хвілін, а ў наступленні – толькі 7.

Лётчык-штурмавік у сярэднім гінуў пры другім вылеце.

Лётчык-выпрабавальнік – у трэцім.

Разлік 45 (50)-міліметровай зброі жыў адно наступленне ворага.

Яны гэта ведалі, але ішлі ў бой.

Уступнае слова настаўніка.

Беларусь – краіна, дзе мы жывём. Гэта наш родны кут. Гэта той край, дзе мы вучымся, працуем, жывём. Гэта квітнеючыя сады, блакітныя рэкі і азёры, радаснае спакойнае жыццё людзей. Але не заўсёды было бязвоблачным неба. Грознае, страшнае слова – вайна! Жудасней слова ў жыцці не знайсці. Рушыць, паліць, знішчае.

Беларусь мая сінявокая! Што прыйшлося табе перажыць у гады вайны? Немцы лютавалі: яны растрэльвалі, катавалі мірных жыхароў Беларусі. Яны не шкадавалі нікога: ні малога, ні маладога, ні старога.

Слайд 2 (малюнак 2).




Малюнак 2

**Вучань 1.** 22 чэрвеня 1941 г. раніцай, калі людзі мірна спалі, нямецка-фашысцкія войскі раптоўна напалі на гарады і вёскі Беларусі. На нашу зямлю пасы-

[1]Урок распрацаваны для вучняў VI класа. Гэта апошні ўрок у раздзеле “Вайна – боль і памяць народа”. Урок праводзіцца ў межах дадатковага чытання. Вучэбныя заняткі маюць выхаваўчую накіраванасць, пастаўленыя задачы дапамагае вырашыць кампазіцыя ўрока. На ўроку прадугледжана работа, накіраваная на фарміраванне ў вучняў функцыянальнай адукаванасці праз развіццё здольнасцей выкарыстоўваць набытыя веды, уменні і навыкі для вырашэння шырокага дыяпазону жыццёвых задач у розных сферах дзейнасці, зносін і сацыяльных адносін (зварот да сімволікі Рэспублікі Беларусь).

[2]Эпіграф: “Сябры, успомнім пра сяброў, / Пра тых, што не прыйшлі”. (Пятрусь Броўка).

паліся тысячы снарадаў і бомбаў. На тэрыторыі Беларусі разгарнулася сапраўдная айчынная вайна.

Слайд 3 (малюнак 3).



Малюнак 3

**Вучань 2** *чытае верш Анатоля Балуценкі.*

Магілы без крыжоў, акопы,
Ланцуг траншэй уздоўж лясоў,
Не ўсе, прайшоўшы паў-Еўропы,
Вярнуліся цэлымі дамоў.
Спяць невядомыя салдаты.
Дана найбольшая цана,
Каб не стралялі больш гарматы,
Хутчэй каб скончылася вайна.

Слайд 4 (малюнак 4).



Малюнак 4

*Зварот да эпіграфа.*

Прачытайце і растлумачце радкі эпіграфа. Як вы разумееце гэтае выслоўе? Звярніце ўвагу на назву раздзела «Вайна — боль і памяць народа».

Слайд 5 (малюнак 5).




Малюнак 5

Мы павінны памятаць пра тых, хто не прыйшоў з вайны, шанаваць іх памяць, клапаціцца пра ветэранаў. І рабіць гэта патрэбна ўсім: і дарослым, і дзецям.

**III. Этап мэтавызначэння.**

Прачытаўшы эпіграф урока і ведаючы назву вывучаемага раздзела, ці можам мы акрэсліць мэту ўрока?

*Вызначэнне мэты ўрока.*




Малюнак 6

Слайд 6 (малюнак 6).

Зыходзячы з тэмы, вызначыце задачы ўрока. Можна выкарыстоўваць ключавыя словы:

**Даведацца** *(змест верша М. Сурначова «У стоптаным жыце»).*

**Запомніць** *(жыццёвы лёс аўтара верша — паэта М. Сурначова; звярнуць увагу на дакументальнасць твора).*

**Навучыцца** *(характарызаваць твор, выразна чытаць вершы).*

Сапраўды, вайна шмат забрала людзей. Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з жыццёвым лёсам Міколы Сурначова — аўтара верша «У стоптаным жыце». Гэты верш быў напісаны на пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у 1941 г.

А таксама ўспомнім тых, хто аддаў сваё жыццё дзеля міру на зямлі, а сам так і не ўбачыў блакітнага неба над галавой.




Малюнак 7

[3]Расказвае падрыхтаваны вучань.

**IV. Этап засваення новых ведаў.**

4.1. Слова пра паэта, які загінуў на вайне[3].

Слайд 7 (малюнак 7).

Родам Мікола Сурначоў з Рагачоўшчыны. Калі б ён не напісаў больш нічога, апрача верша «У стоптаным жыце», то і тады яго імя засталося б у беларускай літаратуры. Студэнтам Мінскага педінстытута паэт трапіў на фронт, прайшоў амаль усю вайну, удзельнічаў у абароне Каўказа, у вызваленні Беларусі, Польшчы, Румыніі і загінуў пад Берлінам, не дажыўшы два тыдні да Перамогі.

Без паэзіі ён не можа жыць нават у акопах, пад абстрэламі і бамбёжкамі. У 1942 г. Сурначоў пісаў свайму сябру Паўлу Пранузу: «Брыдзём дарогай. Пачынае пікіраваць фашысцкі самалёт, а мы ідзём і чытаем вершы М.Багдановіча».

Слайд 8 (малюнак 8).




Малюнак 8

Паэт пачаў друкавацца ў 1938, пасмяротна выйшлі 3 зборнікі, найбольш поўны — «Акопны спеў» (1986).

«У стоптаным жыце» на рускую мову ўмела пераклаў Аляксандр Твардоўскі. Але і астатнія вершы Сурначова напісана ярка, ён мог бы быць адным з лепшых у сваім таленавітым паэтычным пакаленні. Берлін штурмаваў камандзірам узвода. У ноч з 19-га на 20 красавіка 1945 года загінуў, прыкрываючы адыход таварышаў. Пахаваны ў нямецкім пасёлку Фрайдэнберг, што за 8 кіламетраў ад Берлінскай кальцавой дарогі, а потым рэшткі паэта былі перазахаваны на брацкіх могілках Бад-Фрэенвальдэ.

**Настаўнік.** Як ужо было адзначана, верш на рускую мову пераклаў Аляксандр Твардоўскі. Я хачу, каб вы паслухалі рускі варыянт гэтага верша.

4.2. Чытанне верша падрыхтаваным вучнем.

Уже не доехать бойцу молодому
До края родного, до отчего дома.
Лежит он, раскинувшись, руки разбросив,
Над ним обгорелые никнут колосья.
Лежит он, как витязь, в потоптанном жите,
Родную увидите — не говорите.

**Настаўнік.** Маладыя хлопцы спяшаліся на фронт. На жаль, з вайны вярнуліся не ўсе. Сястра паэта Лідзія Мікалаеўна Войленка ўспамінала: «Вершаў у яго было шмат, бо ён складаць іх пачаў рана, гадоў у 13. Калі вайна пачалася, наш бацька паклаў усе Колевы сшыткі ў скрыню і закапаў у агародзе. Пасля вайны мы ўсю зямлю перарылі, але нічога не знайшлі. Не захаваліся і лісты Колі да родных, прапала і яго нязменная спадарожніца — палявая кірзавая сумка, набітая тапаграфічнымі картамі і вершамі…»

А зараз давайце нарэшце пазнаёмімся з вершам Міколы Сурначова

«У стоптаным жыце».

4.3. Выразнае чытанне верша[4].

4.4. Хвілінка адпачынку.

*Я — чалавек*
*Заўсёды гатовы стаць побач або крыху наперадзе,*
*Працягнуць руку дапамогі,*
*Падставіць плячо пад цяжар клопату і турбот,*
*Нахіліцца да малога або слабога,*
*Прысесці і Падняцца пасля няўдач,*
*Змагацца з асабістай лянотай,*
*Абярнуцца да тых, хто не паспявае,*
*Дацягнуцца да мары,*
*Пранесці праз усе жыццё сапраўднае сяброўства,*
*Глыбока ўздыхнуць па тым, што не збылося,*
*Паўтараць усе спачатку — да Перамогі.*

**V. Этап прымянення атрыманых ведаў.**

5.1. Праца над аналізам верша. Гутарка.

Вызначце настрой верша. Чаму такі настрой? *(Сумны, тужлівы, трагічны).*

Якія карціны паўсталі перад вамі? *(Поле, луг, ускраек лесу, шмат света, забіты салдат, каска, зямля, ўзнятая выбухам бомбы).*

Слайд 9 (малюнак 9).




Малюнак 9

З якой інтанацыяй неабходна чытаць верш? *(Са смуткам і шкадаваннем аб тым, што «ніколі не ехаць хлопцу маладому да блізкага гаю, да роднага дому»).*

Вызначце словы, якія ўказваюць на трагічнае гучанне твора. *(Ніколі не ехаць; асыпаюцца краскі; абсмалены колас; стоптанае жыта).*

Якую роль ў апавяданні выконвае аўтар? *(Паэт смуткуе і жаліцца ўсяму свету на несправядлівасць лёсу, што так сурова абышоўся з юнаком-віцязем).*

Слайд 10 (малюнак 10).

5.2. Складанне модуля.

Якім паўстае перад намі салдат? *(Малады, мужны, бязмежна любіць сваю маці, аддыны сваёй Радзіме, не зведаў усе радасці жыцця).*

[4]Верш спачатку чытае настаўнік, пасля вучні.




Малюнак 10

З кім параўноўваецца салдат? *(З віцязем).*

5.3. Слоўнікавая работа: тлумачэнне слова віцязь. Слайд 11 (малюнак 11).




Малюнак 11

Якая мастацкая дэталь праходзіць праз увесь твор, нават вынесена ў назву твора? *(Жыта).*

Слайд 12 (малюнак 12).




Малюнак 12

5.4. Вызначэнне сувязі прыроды з чалавекам.

Нашы продкі лічылі, што жыта з'яўляецца сімвалам жыцця.

Дзеянне верша адбываецца ў прыродзе, што ацалела пасля варожай атакі.

Ці дапамагае нам прырода ў раскрыцці тэмы твора? *(Прырода дапамагае выказаць аўтарскі настрой. Кветкі-краскі, абсмалены колас сцвярджаюць думку аб недапушчальнасці ваенных дзеянняў. Прырода таксама супраць вайны).*

Падумайце і скажыце, з чым асацыіруецца жыта ў песнях?

Жыта ў народных песнях заўсёды звязвалася з жыццём, мірнай працай, шчасцем на зямлі.

Паразважайце, чаму верш мае такую назву. Які сэнс набывае ў творы вобраз «стоптанага жыта?

«Стаптанае жыта» — гэта вобраз смерці, разбурэння, знішчэння, непапраўнай трагедыі, якой стала для нашай краіны Вялікая Айчынная вайна. Яна адабрала мільёны жыццяў, кранула кожную сям'ю.

Разгарніце, калі ласка, свае дзённікі. На форзацы паглядзіце на герб нашай краіны. Вы бачыце каласкі.

Як вы думаеце, сімвалам чаго яны з'яўляюцца?

Вянок, утвораны з пучка жыта, са старадаўніх часоў меў запаветны сэнс для ўсіх славянскіх народаў. Славяне верылі: сноп хлебных каласоў — лепшы спосаб звароту да божых сіл з просьбай аб дараванні новага ўраджаю і працвітання.

5.5. Зварот да вобраза маці.

У апошніх радках верша салдат просіць усіх, хто ведае аб яго смерці, не гаварыць маці. Чаму? *(Адказы вучняў).*

Слайд 13 (малюнак 13).




Малюнак 13

5.6. Чытанне настаўнікам верша Васіля Зуёнка «З вайны сустрэлі мацяркі сыноў...»

Ці ўзаемазвязаны гэтыя вершы?

Супастаўце лёс Міколы Сурначова з лёсам яго героя. *(Назіраецца падабенства. Аўтар, мабыць, прадчуваў сваю гібель, атаясамліваючы яе са смерцю свайго героя, і, магчыма, таксама не хацеў, каб маці ведала пра смерць сына.)*

5.7. Выразнае чытанне верша вучнямі.

**VI. Этап падагульнення вывучанага.**

Калі мы вымаўляем слова *вайна*, якія колеры паўстаюць перад вачыма? Што нясе вайна, а што сімвалізуе сабой мір?

Давайце зноў звернімся да герба і сцяга Рэспублікі Беларусь.

*Работа з унутраным бокам вонкавай часткі вокладкі.*

Якія колеры вы бачыце і што яны сімвалізуюць?

Сцяг мае тры колеры: чырвоны, зялёны і белы.

Чырвоны колер — знак Сонца, сімвалізуе кроўныя повязі, братэрства, барацьбу за справядлівую справу. Ён азначае высокі гонар за здабытую Перамогу. Адначасова гэта знак шчаслівага жыцця. Зялёны колер —

гэта колер прыроды, колер палёў і лясоў, якія здаўна займалі асноўную частку тэрыторыі нашай краіны. Зялёны колер — колер дабра, росту, развіцця, дабрабыту і міру. Белы колер – колер чысціні, мудрасці, свабоды.

Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь з'яўляецца сімвалам дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Ён уяўляе сабой размешчаны ў сярэбраным полі залаты контур дзяржаўнай граніцы нашай рэспублікі, накладзены на залатыя прамяні ўзыходзячага над зямным шарам сонца. Уверсе поля знаходзіцца пяціканцовая чырвоная зорка. Герб абрамлены вянком з залатых каласоў, пераплеценых справа кветкамі канюшыны, злева — кветкамі лёну. Вянок тройчы перавіты з кожнага боку чырвона-зялёнай стужкай, у сярэдняй частцы якой у аснове Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь у два радкі напісаны золатам словы «Рэспубліка Беларусь».

Як ушаноўваецца Вялікая Перамога на гербе і сцягу? *(Чырвоным колерам, пяціканцовай зоркай. Пяціканцовая зорка — сімвал чалавека і чалавецтва, знак мужнасці).*

**VII. Этап падвядзення вынікаў урока. Рэфлексія.**

Уявіце, што вам прапанавалі прыдумаць новую назву раздзела падручніка, у якім вывучаюцца творы пра Вялікую Айчынную вайну. Якую б назву вы далі?

Якую трагічную дату Беларусь адзначала напрыканцы сакавіка? Што вы ведаеце пра Хатынь?

Адзнакі за гэты ўрок не выстаўляю, а выказваю падзяку за шчырасць і адкрытасць душы.

Памяць людская дапамагае людзям адчуць сувязь пакаленняў, адказнасць за лёс сваёй зямлі, мовы, культуры. Скончыць нашу размову хацелася б словамі вядомага беларускага паэта П. Панчанкі: «Жыццё пражыць — не поле перайсці. / А трэба і жыццё пражыць, як поле. / Каб хоць адным зярняткам узысці / І каб асот не заглушыў ніколі».

Няхай на вашым жыццёвым полі спее багаты ўраджай добрых спраў. Помніце пра тых, каму мы абавязаны шчасцем ісці па жыццёвым полі. Няхай не заглушае яго асот бяспамяцтва.

*Гучыць песня "Два полі".*

Звернемся да эпіграфа ўрока. Ці адпавядае эпіграф нашаму ўроку? Ці разгледзелі мы з вамі вобраз салдата?

Слайд 14 (малюнак 14).




Малюнак 14

На дошцы запісаны адказы на пытанне "Што я зраблю пасля сённяшняга ўрока?"

*1. Наведаю бібліятэку, каб узяць і прачытаць кнігу пра вайну.*

*2. Наведаю помнік у гонар загінуўшых землякоў.*

*3. Паспрабую больш даведацца пра лёс маіх сваякоў у гады вайны.*

А зараз мы падвядзем вынікі і закончым прапановы.

*Мне ўрок спадабаўся (не спадабаўся), таму што...*

*Камфортна было працаваць...*

*Мае поспехі...*

*Мае промахі...*

*Якім бы я хацеў бачыць на ўроку сябе...*

**VIII. Этап інфармавання пра дамашняе заданне.**

Напісаць сачыненне "Мой любімы твор пра вайну" (не больш 15 сказаў).

*Дата поступления в редакцию: 29.05.2025*